№ 134 (256)

Чацвер, 7 жніўня 1997 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і кромах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*
Якуб Колас

Народная Воля

Сонца	Усход	Заход
Віцебск	5.17	20.53
Магілёў	5.21	20.47
Гомель	5.24	20.38
Мінск	5.32	20.58
Гродна	5.48	21.12
Брэст	5.54	21.07

Першая квадра 11 жніўня.

Незлобивые заметки

Семен БУКЧИН

Россия торгует своими журналистами

Заметили ли вы, уважаемый читатель, некоторую, скажем так, перемену в настроениях и высказываниях российского президента, касающихся ситуации вокруг арестованных журналистов белорусского корпункта ОРТ?

Сначала Ельцин был очень грозен: "Пусть Лукашенко объяснит мне... А иначе пересмотрим устав Союза!"

Через день это уже была реакция доброго дедушки, которому жалуются на расшалившегося внука. Что делать? Не привык Лукашенко к критике... А вот я, к примеру, привычный к ругани, особливо ежели за дело...

И наконец, почти полное прощение: молодой еще... Опыта не набрался... Но на российско-белорусских отношениях это никоим образом не скажется...

Короче, пересматривать устав Союза не будем.

Сомнений нет — Ельцин вполне управляем. Ежели сначала поднапер Чубайс, в присутствии которого на волжской даче и произносились грозные инвективы в адрес зарвавшегося белорусского союзника, то затем свое слово сказали другие "близкие к телу" люди. Речи их тоже показались г-ну Ельцину вполне разумными. Ну что такое, в самом деле, судьбы каких-то трех журналистов по сравнению с величественной перспективой российско-белорусского Союза? Надо же по-государственному подходить к проблеме! Журналистов у России много, а вот такой верный союзник, как Лукашенко, один на весь белый свет.

Российское руководство давно уже подторговывает своими журналистами. Сколько сейчас у нее похищенных в Чечне? Пятеро. Трое от НТВ уже более трех месяцев числятся "без вести пропавшими". Двое — от "ВИДа". Я считаю, что к этой пятерке вполне можно присоединить белорусскую троицу во главе с Павлом Шереметом. Тут другое дело? Несогласен! То, что произошло у нас, если учесть всю беззаконность случившегося, такое же, по сути, похищение людей. Только еще более наглое, вызывающее. Потому что произошло под якобы прикрытием закона, открыто, на глазах у всего цивилизованного мира.

Итого теперь у России восьмеро похищенных журналистов. И не надо рассказывать мне сказки, что она не в состоянии освободить их — и в Чечне, и в Беларуси. У России есть еще мощный аппарат спецслужб, которые могли бы сработать в Чечне. Есть большие деньги, которые с успехом использовал г-н Березовский там же, на Кавказе. А что касается Беларуси, то здесь еще больше возможностей...

Но, видимо, время еще не пришло для капитального торга. Не пришла еще пора вызволять Елену Масюк с товарищами, журналистов-видовцев. А Шеремет и его коллеги и вовсе еще тепленькие. Не созрели в цене.

Да и Лукашенко не хуже кавказских похитителей умеет торговаться. Что можно, к примеру, потребовать за Шеремета? Скостить долги за газ? Заткнуть глотки ненавистным критиканам с того же ОРТ и других российских телеканалов? Разумеется, такие дела не делаются впрямую. Но ведь и в Кремле не дураки, понимают: молодого и горячего белорусского правителя нужно ублажить. Что-то реальное пообещать. Чтобы не портил столь явно демократический имидж России перед Западом.

Конечно, Лукашенко у нас человек принципиальнейший. Он конституцией и законами не торгует! Ежели он сам незаконно перейдет границу, то и его — в тюрьму! Вот какой у нас президент!

И все-таки пар выпускать понемногу придется. Сначала, скорее всего, выпустят Овчинникова. Шофер — человек подневольный. Что с него взять? К тому же совсем недавно женился. А в народе не любят, когда молодых разлучают. Народ тут жалостлив. Поэтому пьеска будет разыгрываться соответствующая. Выпустят Овчинникова. Что-нибудь не очень строгое дадут Завадскому. Хотя и оператор (снимал гад наши секреты!), но тоже человек подчиненный, приказы, можно сказать, выполнял. Поэтому все будет, как в индийском фильме: добрый, всепрощающий правитель, слезы встретившихся жен и мужей, бросающий в воздух шляпы и чепчики восторженный народ.

На фоне этого ликования судьба Павла Шеремета может показаться просто какой-то досадной незначительной проблемой. Но тут-то и встанет главный вопрос — о цене. Не за газ. Вопрос о цене российской демократии. Нет, не забудут Павла Шеремета его коллеги в России и Беларуси, будут бить во все колокола, стучать во все двери.

Но г-н Ельцин сочтет — уже посчитал! — конфликт исчерпанным. С кем не бывает по молодости? Ну бросил белорусский президент трех безвинных людей в тюрьму! Но ведь одного отпустил. И второму вроде послабление дал. Ну а уж одного наказал — так что, из-за этого одного теперь войну с Беларусью начинать?

Главное — это то, что западная граница России не кончается за Смоленском. До самого Бреста идет. За такую цену и дивизию этих щелкоперов отдать не жалко!

Бліц-рэцэнзія

Гледачы сустракалі "Вітаўта" вельмі цёпла, а вышэйшыя дзяржаўныя асобы ім нават не зацікавіліся...



Ганна — Галіна Фёдарава.



Князь Вітаўт — заслужаны артыст Беларусі Генадзь Давыдзька.



Алена — заслужаная артыстка Беларусі Зоя Белахвосцік.

Доўгачаканы падарунак атрымалі ў мінулую нядзелю аматары беларускага тэатральнага мастацтва. На сцэне Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы адбылася прэм'ера "Князя Вітаўта" — п'есы Алеся Дударава, якая распавядае аб складаным гістарычным лёсе беларускага народа.

Нягледзячы на тое, што дзеянне п'есы разгортваецца ў канцы XIV стагоддзя, нельга не заўважыць пэўных аналогій з цяперашнім часам. Сёння беларускае грамадства, як і ў тыя далёкія-далёкія гады, перажывае пераломны этап свайго развіцця. І тады, і цяпер у цэнтры ўвагі асобы, ад якіх залежыць будучыня нашай краіны. Безумоўна, не трэба шукаць у персанажах п'есы правобразы сучасных беларускіх палітыкаў. На маю думку, гэты твор перш за ўсё прымушае гледача задумацца аб тым, куды мы ідзем, што чакае нашых дзяцей і якой будзе наша родная Беларусь у пачатку трэцяга тысячагоддзя.

Можна бясконца разважаць аб мастацкіх асаблівасцях твора, але справу гэтую пакінем прафесійным тэатральным крытыкам. Што датычыцца пастаноўкі, то ў мяне, звычайнага гледача, яна выклікае вельмі добрае ўражанне. Хочацца падзякаваць мастацкаму кіраўніку і галоўнаму рэжысёру Валерыю Раеўскаму, а таксама ўсяму творчаму калектыву за самаадданую працу па стварэнню цікавага прыгожага спектакля. Захапляе ўсё: і касцюмы, і музычная афарбоўка, і харэаграфія, і, у першую чаргу, вельмі старанная ігра акцёраў. Дарэчы, у спектаклі задзейнічана амаль усё купалаўскае сузор'е. Менавіта пагэтаму бурнымі і працяглымі апладысментамі гледачы віталі артыстаў пасля заканчэння спектакля.

Любая тэатральная прэм'ера — падзея ў культурным жыцці. Прэм'ера ў купалаўскім — падзея ўдвайне. Таму вельмі здзіўляла адсутнасць у зале кіраўнікоў нашай краіны. Тым больш, што гаворка ў п'есе ідзе менавіта пра лёс народа. Аб чым, дарэчы, так любяць разважаць некаторыя вядуныя палітыкі. Але прысутнічаць ці не прысутнічаць — гэта іх асабістая справа. Крыўдна тое, што не толькі Купалаўскаму тэатру — усёй нашай культуры з боку ўлад не хапае дастатковай увагі. Нехта скажа: становішча зараз вельмі цяжкае, і выйсце з яго няпростае, што там тэатр! Але, каб упэўнена ствараць будучыню, трэба часцей звяртацца да мінулага. А сваім "Вітаўтам" Нацыянальны купалаўскі тэатр, на мой погляд, адлюстроўвае наша мінулае вельмі і вельмі добра, дае адказы на многія пытанні сённяшняга дня.

Сяргей РУЧАНАЎ.
Фота Яўгена КОКТЫША.

Провинциалка

Зачем менеджеру Бальзак?

"Жульверн" (он же Жюль Верн), "Аноре Дебользак" (он же Оноре де Бальзак, "Голс Уорси" (Джон Голсуорси) — так зафиксировал один из старшекурсников одного брестского вуза список литературы, надиктованной почасовиком-филологом. Комментировать нечего: денег у братвы все больше, а значит, больше и коммерческих вузов для "фирменных" деток. Правда, во всем черном есть что-то белое — тому же преподавателю, получающему от государства гроши по месту основной работы, что-то перепадает от участия в штамповке "дыпламаваных барана".

Строители или саперы?

Очередная смертельная находка обнаружена строителями, реконструирующими брестский стадион "Динамо". 152-миллиметровый снаряд стал уже седьмым подобным сюрпризом на данной стройплощадке. Похоже, во время войны на стадионе базировались немецкие "самоходки" — на это указывает однотипность раскапываемых здесь боеприпасов. Последний снаряд ждала судьба его предшественников — его вывезли за город и взорвали.

Желтые слезы земли

Уже не секрет, что Брестская область является янтарным краем. Согласно данным Белорусского геологического предприятия "Белгео", коренные проявления янтаря имеются в Жабинковском, Пружанском, Ивановском, Столинском, Лунинецком районах. Ведется разведка месторождений, оцениваются их запасы, составляются карты. По мнению ряда специалистов, часть Брестчины входит в единую территориальную янтарную зону.

Происхождение янтаря предположительно связано с наличием древнего моря, покрывавшего эти места четыре десятка миллионов лет назад. На суше росли сосны, море наступало, губило эти прекрасные вековые деревья, разнося волнами древесную смолу, которая и стала источником зарождения янтаря.

Подготовила
Инна ШАХОВА.

По существу

Опять коллективизация!

...Председатель известного в республике бывшего колхоза имени Свердлова Горецкого района Могилёвской области, а ныне акционерного общества "Горы" Александр Герасимов расстроен. Надо платить людям зарплату, а денег нет.

Собственно, они как бы и есть. Бывший колхоз, а ныне акционерное общество добросовестно производит молоко и отдаёт на переработку местному Горецкому сырзаводу. Давно отдаёт. На полтора миллиарда уже отдали. Но денег не получают. Потому что у сырзавода проблемы со сбытом.

А проблемы со сбытом не потому, что белорусский сыр невозможно продать. В России он идёт, что называется, со свистом и по высокой цене. Но государство запретило продавать сыр иначе как за валюту, потому что оно со своей валютной политикой зашло в тупик. И "зелёненьких" не хватает.

И как никчемная хозяйка, угробившая своих курочек, нёсших золотые яйца, хватает неосмотрительно забредшую соседскую, рассчитывая прирезать её и накормить семью, так и наше государство пытается распоряжаться собственностью, которая ему не принадлежит. Поскольку сырзаводы в большинстве акционированы и государственной собственностью не являются...

Но у нас руководствуются не законами, а революционной целесообразностью. Из-за введенных государством ограничений сырзаводы не могут продать свой сыр и рассчитаться с колхозами. А если колхоз пожелает забрать деньги продукцией и самостоятельно продать её, то это тоже обставлено таким количеством ограничений, что редкие руководители решаются ходить по инстанциям и клянчить разрешительные бумажки.

В результате акционерное общество "Горы", как и другие хозяйства района, которым сырзавод должен уже около 10 миллиардов, своих денег получить не может. И вынуждено брать кредиты — под сев, под уборку. Кстати, государство их даёт. Под будущее зерно.

Но выплатить зарплату всё равно невозможно. Потому что зерновые кредиты могут использоваться только по целевому назначению: под закупку удобрений, горючего, запчастей... То есть заработанных денег государство не платит, а кредитным колхоз не хозяин...

— Если мне дают аванс на зерно, то указывается, для каких целей я могу эти деньги использовать. Отдавать под заработную плату разрешают только там, где она просрочена 2—3 месяца, и то не всем...

Цепочка получается простенькая и милая. Хочешь не хочешь, а бери кредит, поскольку потребители с тобой не рассчитываются. А этим деньгам ты не хозяин. Они как бы твои, но в то же время как бы общественные. И работает хозяйство, и товар производит, и формально является собственником этого товара. А всегда в нищете, потому что распоряжается им кто-то другой.

Собственно говоря, колхозы никогда не были хозяевами того, что производят. Что продавать, кому и по каким ценам им всегда диктовали. Правда, в последние лет 5—6 уже, казалось, перестали. И вот теперь опять диктуют. Причём, похоже, происходит весьма серьёзный процесс, который можно определить как обобществление денег!

Всякий рынок начинается с персонификации денег — больше заработал, больше получил!

Всякий социализм — с того, что деньги, как и средства производства, обобществляются. Сколько и кто заработал — разобраться невозможно без хорошей выпивки! А уж сколько и кому получать — вообще решает неизвестно кто, неизвестно как и неизвестно почему!

Вот, обобщённо говоря, суть того самого "рыночного социализма", который нам и навязывают в качестве модели государственного устройства.

То, что происходит сегодня с деньгами, и что, на первый взгляд, выглядит вполне безобидно, мы, наверное, имеем полное право назвать коллективизацией. Второй. Поскольку первая уже была. И тоже начиналась вполне безобидно...

...25 000 Семёнов Давыдовых приехали в деревни и с помощью местных Макаров Нагульновых "делали" коллективизацию. Но она не шла.

Если в 1918 году было коллективизировано 0,1 % хозяйств, то в 1927 году — 0, в 1929 — 1,7, к середине 1929 — всего лишь 3,9 процента.

Но народная власть — это вам не слюнявая интеллигенция. И с теми из народа, кто посмел противиться, начали поступать по-народному...

"...Уполномоченными РИКа Жевлатовым и Ивановым производились массовые аресты бедняков и середняков за невывоз семфонда, содержание их под стражей в подвале при сельсовете вместе со скотом, избиение бедняка, пьянство, сопровождаемое половым использованием учительницы, жены лишенца, бывшего офицера, стрельба по селу, обыски, приставание к девушкам, арест своих же уполномоченных — членов партии и сопровождение их в сельсовет с обнажённым оружием. Последнее имело место и в отношении других арестованных, которых водили и стреляли..."

В архивах таких докладных — мешки! Уместившие неимоверное количество бесхитростной правды о легендарных симпатичных литературных героях. А заодно и о трагедии, именуемой совсем не страшно и даже как-то по-научному — коллективизация.

А ведь на самом деле страшно! Хотя бы потому, что нужное количество Макаров Нагульновых и Семёнов Давыдовых с наганами в карманах пиджачков у нас найдётся и сегодня!

Алесь БУСЛАЕВ.

Газета — читатель

Вы вернулись из отпуска и хотите знать, о чем пишет "Народная воля"? Тогда заполняйте абонементный бланк!

Нам звонят и говорят: "Все лето проводим в деревне у родных..." Или: "Два месяца жил на даче — в июне на заводе дали за свой счет, а в июле был отпуск. Вернулся в город, хочу ежедневно получать газету "Народная воля", как этот вопрос решить?"

Сразу скажем: если Вы заглянете на почту или в любой подписной пункт до 10 августа, то с 1 сентября у Вас на столе каждый день будет лежать "Народная воля". За 29 тысяч рублей — цена, можно сказать, одного обеда — Вы будете знать все новости не только нашей республики, но и мирового масштаба.

Индекс "Народной воли" — 63222.

Вы — с "Народной волей" и "Народная воля" — с Вами!

Такого еще не было

И морской поцелуй, и прикосновение к истокам цивилизации...

А также — поездка за шубами, дегустация "Метаксы", посещение "пупа земли" — Омфалокса... Обо всем и не расскажешь. Впервые для белорусов предлагает такой оригинальный и необыкновенный тур минский "Спутник" (тел. для контактов 233-36-13).

Туристы проживают в отеле недалеко от Афин на живописном берегу моря. Здесь есть все: прекрасный песчаный пляж, теплое и прозрачное море, теннисные корты, детплощадки, завтраки и ужины в ресторане... Но прелесть тура — в поездках по экзотическим островам, где сохранились следы истоков цивилизации, в посещениях самых известных творений рук человека — храма Аполлона, сокровищницы афинян... И в поездке за шубами, которые здесь самые красивые и дешевые в Европе.

Иван ПЕТРОВ.

З першых вуснаў

Юрый ЛУЖКОЎ:

"Масква трымаецца на малым і сярэднім бізнесе"

"Палова маскоўскага бюджэту складаецца з прыбытку малога і сярэдняга бізнесу. У Маскве зараз існуюць 240 тысяч прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу. Без яго горад быў бы такім жа жабрацкім, як і значная частка гарадоў Расіі..."

Гэтыя словы належаць мэру Масквы Юрыю Лужкову. Гэты надзвычай рухавы і энергічны чалавек у мінулую пятніцу правёў прэс-канферэнцыю для кіраўнікоў журналісцкіх арганізацый краінаў СНД і Балтыі. Магчыма, таму, што Лужкоў вярнуўся ў свой горад з буйнога форуму бізнесменаў у Лос-Анджэлесе ўсяго за пяць гадзін да пачатку нагаданай сустрэчы, ён адразу пачаў гаворку пра значэнне бізнесу для Масквы.

Дарэчы, Лужкоў адразу падкрэсліў: ключ да поспеху не толькі ў Маскве, але і ў Расіі, і ў іншых краінах СНД ляжыць у падтрымцы малога бізнесу. Мэр адзначыў, што ў гэтай сферы ёсць і свае прайдзісветы, і аферысты, і крымінальныя элементы... Але ж, адсякаючы іх, бізнес трэба, безумоўна, развіваць. Лужкоў назваў цікавую лічбу — дзяржаўныя прадпрыемствы сталіцы Расіі за апошні час выкінулі за заводскую браму 1 200 000 рабочых, якія маглі стаць беспрацоўнымі. Але ўсіх іх паглынула новая эканоміка. І таму беспрацоўных у Маскве зараз няма. Наадварот, тут працуюць брыгады з Беларусі, Украіны, Малдовы, іншых рэспублік былога Саюза. І кожнаму знаходзіцца справа.

Па словах Лужкова, выканаўчая ўлада Масквы нармальна працуе з заканадаўцамі. Калісьці ў маскоўскіх Саветах было аж пяць тысяч дэпутатаў. І тады адбываліся не пасяджэнні, а суцэльны мітынг. Цяпер тут усяго 35 чалавек. Але ж працуюць яны выключна на пастаяннай аснове, маюць камп'ютэры, шмат даведачных матэрыялаў, бібліятэку, памочнікаў і гэтак далей. Бяруць яны, як кажуць, не колькасцю, а якасцю. І за гэта атрымліваюць добрыя грошы. У прыватнасці, заробак дэпутата маскоўскай Думы вышэйшы, чым у калег з расійскай Дзярждумы. Сталічная Дума зацвярджае бюджэт, і ўрад Масквы вымушаны падпарадкоўвацца яе рашэнню.

Яшчэ адзін напрамак сучасных эканамічных рэформ у Маскве — прыватызацыя. Ад яе сталіца Расіі мае штогод 6—7 трыльёнаў расійскіх рублёў. У Маскве працэс прыватызацыі значна адрозніваецца ад чубайсаўскага. Па словах Лужкова, перш-наперш трэба вырашыць, што пакінуць за дзяржавай, паколькі няма сэнсу аддаваць камусьці курыцу, якая нясе залатыя яйкі. А па-другое, патрэбна прадаць тое, што вырашылі прыватызаваць, за сапраўдную цану. Для тлумачэння гэтага тэзіса Лужкоў прывёў такі прыклад: нейкі прадпрымальнік купляе завод за 60 тысяч долараў. З завода робіцца сховішча, станкі прадаюцца, і літаральна за некалькі месяцаў ён вяртае сабе затрачаныя грошы, а затым атрымоўвае прыбытак. А што далей будзе з вытворчасцю — бізнесмена гэта не хвалюе. А вось калі прадаць той жа завод па рэальнаму кошту, напрыклад, за 600 тысяч долараў, дык пускаць яго пад сховішча будзе безсэнсоўна. А таму новы гаспадар павінен будзе развіваць вытворчасць.

Такі падыход дае магчымасць масквічам мець надзвычай багаты гарадскі бюджэт. З яго больш за трэць ідзе на падтрымку працаўнікоў бюджэтнай сферы. Напрыклад, у Маскве настаўнікі, лекары, навукоўцы атрымліваюць ад урада сталіцы 40 працэнтаў дадаткова да сваёй рабочай стаўкі. Калі мінімальная пенсія ў Расіі складае 80 тысяч рублёў, дык у сталіцы — аж 320. Да таго ж кожны пенсіянер у Маскве бясплатна ездзіць у грамадскім транспарце: метро, тралейбусе і гэтак далей. У Мінску пра гэта можна толькі марыць.

У адрозненне ад таго ж Мінска, заходнія інвестары ахвотна ідуць у Маскву. Як патлумачыў Юрый Лужкоў, сталічная мэрыя мае вялікія валютныя фонды ў банках Францыі і Швейцарыі. Робіцца гэта дзеля таго, што калі нейкі замежны інвестар "пагарыць" па віне маскоўскіх улад і еўрапейскі суд прызнае гэта, дык ён у любы момант можа атрымаць кампенсацыю з рэзервовага фонду. Таму ні амерыканцы, ні немцы, ні інвестары з іншых краін не баяцца ўкладаць грошы ў эканоміку расійскай сталіцы. "Сёння гарантыі ўрада Масквы цэняцца вышэй, чым гарантыі ўрада Расійскай Федэрацыі", — з гордасцю адзначыў мэр.

Лужкоў падкрэсліў, што ні ён, ні яго паплечнікі не адказваюцца ад усяго лепшага, што маецца ў іншых гарадах свету. Напрыклад, пасля паездкі ў Парыж дэлегацыя маскоўскай мэрыі даведалася, што там кожны ўласнік трымае фасады будынкаў у прыстойным выглядзе. Калі ён гэтага не выконвае, дык за яго гэта зробяць гарадскія ўлады. Але ж выставяць падвоены рахунак, і "лішнія" грошы пойдуць у бюджэт горада. Цяпер такі ж закон прыняла і маскоўская Дума.

Юрый Лужкоў лічыць, што маскоўскі вопыт можа лёгка прыжыцца ў сталіцах іншых краін СНД. Але ж для таго, каб народ падтрымліваў мэра і ягоную палітыку, неабходна адна ўмова — кіраўнік гарадскіх улад павінен выбірацца ўсім народам, а не прызначацца некім, нават прэзідэнтам. Бо без даверу не будзе станоўчых вынікаў.

Падчас прэс-канферэнцыі Юрый Лужкоў выказаў свае адносіны і да Беларусі. Адказваючы на пытанне галоўнага рэдактара "Звязды" Уладзіміра Наркевіча аб яго адносінах да ініцыятывы дэпутата Дзярждумы Мікалая Ганчара аб правядзенні рэферэндуму па аб'яднанню Беларусі і Расіі ў адну дзяржаву, маскоўскі мэр паставіўся да гэтага "катэгарычна адмоўна". Ён патлумачыў, што для ўсенароднага апытання няма ніякіх падстаў, паколькі "пытанне інтэграцыі ў любой ступені абсалютна яснае. Адказ ужо быў дадзены неаднаразова. Новы рэферэндум толькі адцягне ўвагу ад канкрэтных спраў. А яны сёння цалкам спыніліся..." Лужкоў лічыць, што трэба не размаўляць, а пастаянна працаваць і пачынаць гэтую вялікую справу неабходна з прывядзення да адзіных нормаў заканадаўстваў дзвюх краін.

Цікава, што ў той дзень, калі мэр Масквы праводзіў сваю прэс-канферэнцыю, у часопісе "Новое время" быў надрукаваны матэрыял пра фальстарт Лужкова. Нагадаю, што фальстарт на мове спорта азначае заўчасны старт. Аўтары артыкула мяркуюць, што маскоўскі мэр заўчасна пачаў сваю перадвыбарную кампанію за пасаду прэзідэнта Расіі. Мне цяжка каменціраваць гэтую думку, але ж падчас прэс-канферэнцыі адчувалася: маскоўскі галава вельмі хацеў спадабацца журналістам. Магчыма, праз розныя сродкі масавай інфармацыі ён хацеў паказаць свае кіпучыя рэфарматарскія здольнасці. Тым больш што сваё выступленне Лужкоў скончыў словамі: "Калі б рэформы па ўсёй Расіі рабіліся так, як гэта робіцца ў Маскве, у расіян не быў бы падарваны давер да каштоўнасцяў рыначнай эканомікі". З гэтым вывадам немагчыма не пагадзіцца.

Уладзімір ГЛОД.
Мінск — Масква.

Не магу маўчаць

Як гэта зразумець і назваць?

Не ведаю, ці ёсць у сучаснага чалавецтва словы, каб назваць тое, што зараз дзеецца ў дачыненні да нас.

Ва ўсім цывілізаваным свеце прынята дапамагаць тым, хто вучыць дзяцей, хто гадуе літаратурнае слова, хто навучаецца роднай мове і гісторыі. Калі б хто і рашыўся адбіраць ліцэй у навучэнцаў, клуб — у настаўнікаў, Дом — у літаратараў, дый і то ў выпадку смяротнай небяспекі, аблогі горада ці нападу на Радзіму, словам, у надзвычайных абставінах. А тут...

Наш дом — гістарычная каштоўнасць. Тут бывалі, меркавалі, казалі сваё слова пра жыццё і літаратуру Крапіва, Максім Танк, Куляшоў... Спіс можна доўга прадаўжаць. Тут мы сустракаліся са сваімі чытачамі, з акцёрамі высокага класу, з буйнымі грамадскімі дзеячамі. Тут гасцявалі і працавалі разам з намі нашы сябры па пяру, выдатныя людзі з Украіны, Расіі, Літвы, Латвіі, Польшчы, Казахстана, Балгарыі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Індыі, ЗША, іншых краін свету.

Дом літаратара — наша ўласнасць, бо будаваўся за сродкі Літфонду, а калі часткова і за дзяржаўныя, дык усё роўна, згодна з існуючым на той час і сённяшнім заканадаўствам, будынак даўно перайшоў ва ўласнасць пісьменніцкага Саюза.

У чые кіпцюры трапіць гэты скарб? Каму, за што і на што перадаецца наша дабро? Усё грамадства павінна ведаць, што распараджэннем прэзідэнта Дом перадаецца "в оперативное управление делами президента" і перадаецца для... "обеспечения органов государственного управления необходимыми помещениями". Вось так. Ні больш ні менш. Аказваецца, гэтым самым дзяржаўным органам неабходныя памяшканні, а творчым людзям яны непатрэбны.

Акрамя ўсяго іншага, такая акцыя абражае памяць П.Машэрава. Памятаю, як ён клапаціўся пра будаўніцтва Дома, як цікавіўся ходам будоўлі, як потым бываў тут на нашых з'ездах і пленумах, прывозіў гасцей высокага рангу паказваць, які Дом у нашых пісьменнікаў.

Звяртаюся да маладзейшых сяброў: калі будзеце ладзіць пікеты ў абарону свайго Дома, то выклічу "хуткую дапамогу", і хай поруч з вамі паставяць мае насілкі. Дальбог!

Максім ЛУЖАНІН.
Жнівень 1997 г.

Перестройка по-белорусски

О судьбе "челноков", которые, похоже, свое отъездили после введения новых правил таможенного оформления

Излов "злейшего врага" границы Павла Шеремета стал, как ни странно, не самым горячим пограничным событием июля. Куда большую сумятицу внесло введение нового порядка провоза через границу личного имущества граждан. Положение о порядке таможенного оформления личного имущества самого широкого спектра — от колбасы до автомобилей — вступило в силу с полуночи 24 июля, ошарашив внезапностью не только добропорядочных "челноков", но и само таможенное начальство на местах.

В результате на всех пограничных переходах Беларуси воцарилось нездоровое затишье. Даже на вечно заторном от наплыва "челноков" и автомобильных перегонщиков брестском переходе "Варшавский мост" таможенным инспекторам впору было сесть забивать "козла". Желающих пересечь Государственную границу Республики Беларусь в каком бы то ни было — что туда, что обратно — направлении не имелось.

Согласно новым правилам, каждый пересекающий границу обязан представлять к таможенному оформлению все личные вещи. И если, процитируем документ, "характер, количество, периодичность перемещения однородных вещей или обстоятельства поездки лица дают основания утверждать, что вещи предназначены для использования в коммерческих или производственных целях и получения дохода", хозяину вещей отныне вменяется здесь же, на таможне, производить... многочисленные налоговые платежи. Другим вариантом стало предоставление физическим лицом, пересекающим границу с таким имуществом, финансовых гарантий последующей уплаты податей. Проще говоря, если нет у вас с собой положенной суммы, вы должны оставить залог. Почти как в ломбарде. Внести в специальную кассу на границе (фиксированный для каждой категории вещей) гарантийный взнос, который возвращался бы вносителю после ликвидации им своих налоговых и пошлинных долгов.

Известно же: хрен редьки не слаще. Как при первом, так и при втором варианте пересекающему границу лицу требовались свободные деньги. Но у тех, кто в момент введения нового таможенного положения находился в пути за границей, — таких сумм, разумеется, не имелось, поскольку сама логика базарно-челночного бизнеса обратного привоза денег никак не предусматривает. Нововведение таможенников уже у первых "челноков" вызвало шоковое состояние. Поистине, глаза велики не только у страха, но и... у жадности. А если перепуганная жадность по природе своей еще и глупа — определенно жди... более конкретных нелепостей.

Правительство в поисках легкой прибыли просто пускает всевозможных "несушек" под нож. Тут уже не до золотых яиц. Хотя бы не перевелись простые... Не сумев добиться отдачи от гонящих на склады ненужный вал заводов, власть решила содрать очередную шкуру с ненавистных первому лицу "дармоедов-спекулянтов". Причем без элементарного здравого смысла: подобные нововведения никогда и нигде не вводятся непосредственно с момента подписания.

Загнав в угол "непропускных" коммерсантов, руководители брестской таможни вели тем временем непростую дискуссию с вышестоящим начальством. По-видимому, были они в том не одиноки — высшее таможенное руководство республики признало собственный перегиб и — нет, не отменило — **отложило на десять суток** ввод в действие своего творения. Драконовская его сущность не оставляет сомнений: разбитое экономическим параличом государство спускает последних псов, стремясь загнать на бойню захудалую дойную корову, каких осталось немного.

И все же, благо, хоть этой партии без вины виноватых коммерсантов-"челноков" удалось вместе со своим товаром пересечь границу в обратном направлении.

Следующего рейса у многих из них уже не будет.

Геррард СИНИЙ.

От редакции. *Как сообщили нам в Таможенном комитете, срок вступления в силу этого руководящего документа продлен еще на полмесяца — до 18 августа с. г.*

Стоп-кадр





Архітэктурнай жамчужынай сярод старажытных беларускіх гарадоў вылучаецца прыгажун Нясвіж. Упершыню пра яго ўзгадваецца ў летапісу 1223 года ў сувязі з імем князя Юрыя Нясвіжскага, які загінуў у бітве на рацэ Калке. З 1533 па 1793 год горад быў прыватным уладаннем князёў Радзівілаў. За вельмі кароткі час (1584—1616) Радзівілы адбудавалі новы горад, запрасіўшы дзеля гэтага італьянскага архітэктара Я.М.Бернардоні. Цэнтрам горада ў тыя часы была рынкавая плошча, сярэдзіну яе займала ратуша, абкружаная гандлёвымі радамі.

Многае разбурыў час, але многае і захавалася з архітэктурных помнікаў белакаменнага Нясвіжа. Напрыклад, захаваліся да нашых дзён манастыр і вядомы замак Радзівілаў з прылеглым да яго паркавым ансамблем — сэрца горада, яго візітная картка.

Здымкі, зробленыя фотакарэспандэнтам БелТА Аляксандрам ДЗІДЗЕВІЧАМ, яскрава сведчаць аб своеасаблівым каларыце Нясвіжа, яго багатай гісторыі і культуры сярэднявечнай Беларусі.

На здымках: *від на замкавую званіцу, гадзіннікавую вежу; куток паркавага ансамбля замка Радзівілаў.*

Фота Аляксандра ДЗІДЗЕВІЧА, БелТА.

Протест

Верните деньги, правители!

Сколько разговоров идет по поводу вкладов!

Мой отчим Павлов Виктор Сергеевич — участник войны, инвалид III группы. Был ранен, дошел до Берлина. Он умер. Мать — инвалид II группы труда Павлова Мария Захаровна — накопила около 5 тысяч рублей. Они и лежат в сберкассе, видимо, в той же сумме.

Я заявляю от имени матери, что деньги пора возвращать. Они были заработаны честно.

Верните деньги, правители!

Валерий БЫСОВ.

г.Кричев.

Крымінал

У Швецыі забілі грамадзяніна Расіі

Грамадзянін Расіі ва ўзросце 46 гадоў, які некалькі апошніх гадоў жыў у Швецыі, быў застрэлены 4 жніўня нейкім веласіпедыстам. Гэта адбылося каля гандлёвага цэнтра горада Мальме на вачах непаўналетняга сына ахвяры.

Паліцыя Швецыі не мае пакуль што ніякіх версій адносна гэтага здарэння і заяўляе, што забіты раней не значыўся ў паліцэйскіх архівах.

Інэса МОІН, БелТА.

Зніклі не бясследна

Налётчыкі, што дзёрзка напалі ў 9.30 24 чэрвеня на ашчаднае аддзяленне філіяла "Беларусбанка" па вуліцы Кіжаватава ў Мінску і забралі з сабой 59 мільёнаў беларускіх рублёў, "наслядзілі" не толькі тут. Новы крымінальны "след" яны пакінулі 16 ліпеня ў такім жа банкаўскім аддзяленні ў Плешчаніцах. Там іх "выручка" склала 43 мільёны "зайчыкаў". Як імі распараджаўся затрыманы за гэтыя злачынствы жыхар Макееўкі Данецкай вобласці і якія былі далейшыя "гастрольныя" планы з саўдзельнікамі, высветліць следства.

Не вывез быстраходны "Мерсэдэс"

Паведамленне ў Жлобінскі ГРАУС ад работніцы мясцовай службы бытавога абслугоўвання паступіла праз 5 мінут пасля ўчыненага злачынства. Як высветлілася, у 20.50 у кватэру пазванілі, і жанчына неабдумана адчыніла дзверы. Уварваўшыся ў кватэру, трое налётчыкаў у масках звязалі гаспадыню і яе мужа, забралі залатыя вырабы і ўцяклі на аўтамабілі "Мерсэдэс".

У 21.10 нарад участка дарожнай міліцыі Лебядзеўка, які быў задзейнічаны ў план "Перахват", за ўчынены грабёж затрымаў траіх непрацуючых магіляўчан — мужчын і жанчыну. У "Мерсэдэсе" знаходзілася і ўкрадзенае.

Сяргей ЦІВАНАЎ.

Пад дахам 13-га вагона за мяжу не паедзеш

Народ здатны на выдумкі, асабліва калі гэтыя выдумкі дапамагаюць на халяву паехаць працаваць за мяжу. Менавіта на гэта разлічвалі двое "працаголікаў", якіх пагранічнікі атрада пагранкантролю "Брэст" знайшлі пры аглядзе пасажырскага поезда "Саратаў — Берлін" у... міжстолевай прасторы 13-га вагона.

Як сказалі карэспандэнту БелТА ў прэс-цэнтры Дзяржаўнага камітэта Пагранічных войскаў, дакументаў у затрыманых, зразумела, не было. Аднак мяркуецца, што яны з'яўляюцца грамадзянамі Расіі і спрабавалі выехаць "на заробкі" ў Германію.

Прыкладна гэтую ж мэту ставіў і грамадзянін Афганістана Ахмед Бажыр, якога беларускія пагранічнікі затрымалі ў пункце пропуску "Варшаўскі мост" у час пагранічнага кантролю аўтобуса "Сетра". Ахмед спрабаваў выехаць за мяжу, выкарыстаўшы падроблены замежны пашпарт з сімволікай СССР, у якім зрабіў кваліфікаваную замену фотакарткі, дамаляваўшы пячатку.

І расіяне, і афганец затрыманы пагранічнікамі на трое сутак для ўстанаўлення асоб і вызначэння сапраўдных мэт перасячэння беларускай граніцы.

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ, БелТА.

Искренне

Беларусь – одна во всем мире

Уважаемый президент! Дорогой мой земляк! Я — русский белорус. Корни мои из России, но я родился на этой прекрасной зеленой земле. Прожил на ней полвека. Бывал в Германии, Польше, Японии. И всюду восхищаются природой и щедрыми людьми Беларуси.

Вы тоже человек этой земли. Вы с самых корней земной человек. И я хочу надеяться, что с Вашей помощью возродится Беларусь.

Скажу: Беларусь не должна раствориться в московских кабинетах и кремлевских опытах. Беларусь — одна в мире. Беларусь не должна быть чьим-то оплотом. Беларусь должна пахнуть медом, травами, сеном и молоком, спелыми яблоками. Беларусь должна жить вечно в мире. Не надо АНТИНАТОВСКИХ БЛОКОВ! Уже известно, к чему привели эти блоки. Не надо пугать НАТО. Надо создавать на земле блоки МИРА и ПРОГРЕССА!

И Беларусь должна сейчас стать одним из первых в мире блоков МИРА и НАДЕЖДЫ XXI века! Беларусь без угроз! Молодежь и другие люди больше будут с Вами и за Вас, когда Вы станете именно человеком МИРА. Вы должны быть олицетворением БЕЛАРУСИ. Чтобы при словах "президент Беларуси" все в мире вставали от уважения к ВАМ!

Чтобы при словах "президент Беларуси" долго слышалось эхо аплодисментов. Сейчас все должно быть воедино — и возрождение Беларуси, и будущее нашей республики, и мир.

Валерий БЫСОВ, лауреат премии Союза журналистов Республики Беларусь 1993 года.

г.Кричев.

У нашых суседзяў

Цэны на камунальныя паслугі ў Літве прыраўнаваны да сусветных

З трывогай чакае набліжэнне ацяпляльнага сезона насельніцтва Літвы. З 1 жніўня ў мэтах дэцэнтралізацыі энергетычнай гаспадаркі рэспублікі ўрад увёў свабодныя цэны на гарачую ваду, ацяпленне і іншыя камунальныя паслугі.

Паводле падлікаў мясцовых камунальных структур, з гэтага часу кошт аднаго кубаметра гарачай вады будзе складаць у сярэднім не 6, а 8 літаў, што эквівалентна прыкладна двум доларам ЗША. Цана аднаго квадратнага метра плошчы, якая ацяпляецца, узрасце з 4 да 7 літаў. Больш беражліва літоўцам прыйдзецца расходваць і электраэнергію. Хоць яе кошт пакуль застаецца адзіным на ўсёй тэрыторыі Літвы, падаражанне ўжо адбылося — з 20 да 22 цэнтаў за кілават/гадзіну.

Зразумела, што новыя цэны будуць непасільнымі для найменш забяспечаных слаёў насельніцтва рэспублікі. У сувязі з гэтым урад вырашыў кампенсаваць частку расходаў на ўтрыманне кватэр пенсіянерам, беспрацоўным і іншым малаабароненым слаям грамадства. Праўда, калі наяўная ў іх жылая плошча перавышае нарматыўную, і ім прыйдзецца аплачваць яе па агульных, ужо на самай справе сусветных цэнах.

Альгімантас БРАЗАЙЦІС, БелТА.

...Как мертвому припарка

Студентов будут датировать. Символически

Совет министров принял постановление о социальной поддержке учащейся молодежи.

В соответствии с этим документом, с 1 сентября текущего года иногородним студентам государственных высших и средних учебных заведений, а также профтехучилищ расходы по найму жилья будут ежемесячно компенсироваться в размере 25 процентов от минимальной заработной платы, то есть тридцати семи тысяч пятисот рублей. Однако и эта помощь будет осуществляться лишь для тех студентов, которым не хватит мест в общежитиях, и они будут вынуждены ютиться по чужим углам. Да и найдет ли студент квартиру за 37 тысяч "зайчиков"?

ААН адпраўляецца ў крыжовы паход супраць СНІДу

Сусветную кампанію па барацьбе з вірусам імунадэфіцыту чалавека, прысвечаную тэме "Дзеці свету і СНІД", абвясціла днямі Арганізацыя Аб'яднаных Нацый. Праграма разлічана на 1997 год і мае на мэце значнае зніжэнне магчымасці заражэння СНІДам ва ўсім свеце і забеспячэнне адэкватнага лячэння і падтрымкі хворых.

У цэнтры ўвагі гэтай кампаніі ААН знаходзіцца чалавек ва ўзросце да 18 гадоў, што адпавядае азначэнню "дзіця", якое прыведзена ў Канвенцыі ААН па правах дзяцей. Па задуме кіраўнікоў праграмы ААН-СНІД, кампанія 1997 года павінна плаўна перайсці ў кампанію наступнага года, якая засяродзіць сваю ўвагу на моладзі.

Згодна з нядаўна апублікаванай справаздачай ААН-СНІД, кожны дзень 1000 дзяцей ва ўсім свеце заражаюцца ВІЧ. Амаль 90 працэнтаў з іх атрымліваюць вірус ад ВІЧ-пазітыўных маці да і ў час нараджэння або праз грудное малако. Паводле ацэнак экспертаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, да канца 1997 года колькасць заражаных дзяцей ва ўзросце да 15 гадоў дасягне 1 мільёна. Гэта рэкордны паказчык, і няма ніякіх прымет, што ўзровень інфіцыравання будзе зніжацца.

Вадзім МІЛІЦЫН, БелТА.

Сонца можна не баяцца

Спецыялісты Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынга азанасферы на падставе штодзённых назіранняў за станам атмасферы над тэрыторыяй рэспублікі прыйшлі да адназначнага вываду: гэтым летам сонца ў нас можна не баяцца. Ад небяспечных для жыцця ўльтрафіялетавых патокаў, якія яно выпраменьвае, нас надзейна засцерагае азонавы слой. Яго стан заставаўся бездакорным на працягу ўсяго ліпеня. На мінулым тыдні таксама адзначалася яго стабільнасць — утрыманне азону фіксавалася на ўзроўні 315 адзінак Добсана, што адпавядае сярэднекліматычнай норме.

Таццяна СМІРНОВА.

Яны абаранялі Магілёў

Сталі вядомы імёны яшчэ 49 абаронцаў Магілёва, якія аддалі сваё жыццё ў ліпеньскія дні сорак першага года ў час абароны горада ад фашысцкіх захопнікаў.

Праз 56 гадоў у Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расіі знойдзены сшытак са спісам воінаў, якія загінулі 12 ліпеня 1941 года. Яго расшыфроўка сведчыць, што гэта байцы і камандзіры 3-га батальёна 388-га стралковага палка 172-й стралковай дывізіі. Цяпер родныя і блізкія даведаюцца, дзе загінулі іх бацькі, сыны і браты. Імёны іх, як і раней устаноўленыя, будуць высечаны на мармуровых плітах мемарыяльнага комплексу, узведзенага на Буйніцкім полі пад Магілёвам.

Мікалай НАЗАРОВІЧ.

В сентябре – три года IBB


ВЕСТИ из IBB

№ 6 август 1997

Ежемесячная подборка материалов из Минского международного образовательного центра (IBB-ММОЦ)

Место встреч и свободного диалога

Клаус БАЙЕР



Более двух лет я являюсь руководителем Минского международного образовательного центра с немецкой стороны. Прошедшие месяцы наполнены большой работой, многими интересными проектами, задачами и инициативами. Достаточно продолжительное время после открытия центра мы находились в фазе становления, то есть преодолевали трудности и в вопросах оснастки, и в деле квалификации наших сотрудников. Полагаю, что эти нелегкие времена уже позади, и можем больше сконцентрироваться на дальнейшем развитии содержания своей работы.

Прошедшие годы обогатили мой собственный опыт и опыт моей супруги, которая оказывает мне большую поддержку во время работы в Минске, впечатлениями, поистине глубоко повлиявшими на нашу жизнь. Особенно ценными видятся разнообразные социальные контакты, а также завязанные нами личные и служебные связи, которые облегчили наше вживание в новое окружение и связанное с этим лучшее понимание этого нового окружения.

Самым естественным образом здесь увязывается личностное с задачами и философией нашего предприятия — быть местом встреч и сотрудничества, совместным белорусско-германским домом в общеевропейском доме, выступать под знаком примирения.

Минский МОЦ может оглянуться на достаточно впечатляющие итоги своей работы. Об этом свидетельствуют даже те 15000 человек, которые ежегодно принимают участие в более чем 200 мероприятиях. При этом участники встреч представляют все континенты земного шара. Это не может нас не радовать, и мы гордимся этим. Большой международный резонанс свидетельствует о том, что за прошедшее время мы провели хорошую и большую работу, а наши гости довольны сервисом и предлагаемыми услугами.

Хотелось бы пожелать себе (и именно на это направляем все наши усилия), чтобы ММОЦ и в дальнейшем выделялся как место встреч и свободного диалога, внося тем самым свой вклад в построение гражданского общества на пути в единое общеевропейское, международное будущее. Для этого мы будем делать все, что в наших силах.

На снимке: *Клаус Байер.*

Партнеры

Из тройки гигантов

Среди фирм, арендующих под свои офисы помещения ММОЦ, немецкий концерн "Байер АГ" является едва ли не самым известным.

В списке крупнейших немецких фирм он, с годовым оборотом более 45 млрд. марок, занимает 9-е место и является пятым по величине работодателем, обеспечивая рабочие места для 160 тысяч человек.

Концерн принадлежит к тройке гигантов немецкой химической промышленности, известной во всем мире. Он специализируется на производстве продукции органической и неорганической химии, пластмасс, каучуков, красок, средств защиты растений и фармацевтической продукции. Всемирную славу ему принес аспирин — лекарственный препарат, производство которого было впервые налажено фирмой "Байер АГ".

В Беларуси немецкий концерн торгует преимущественно лекарствами, химической продукцией для сельского хозяйства и промышленности. Объемы сделок ежегодно увеличиваются.

Укрепляется и деловое сотрудничество с белорусскими предприятиями. Глава представительства "Байер АГ" в Беларуси Ханс-Йохим Фельдхаус был назван редакцией журнала "Дело" в 1996 году человеком года в номинации "Поддержка бизнеса и предпринимательства в Беларуси". Кстати, среди победителей он — единственный иностранец.

Женская программа ММОЦ

Время диктует новые подходы к пониманию роли и места женщины в обществе. Сегодня степень цивилизованности страны определяется отношением к слабому полу. Об этом судят по гарантиям прав женщин, по уровню их вовлеченности в государственную деятельность, по доступности для них СМИ для выражения своих взглядов.

Женщины Беларуси еще слабо вовлечены в общественные и политические процессы, которые формируют гражданское общество. Тем не менее женское движение уже становится реальностью. Само по себе это свидетельствует о появлении новой социальной потребности в нашем самовыражении, а также новых проблем, связанных с экономическими и социально-политическими преобразованиями.

В прошлом году женское движение в Беларуси отличалось повышенной активностью. Во многом это связано с деятельностью IBB. Здесь прошли "круглый стол" "Интеграция и контакты: международное женское движение и женские НПО Беларуси", семинары "Женщины и нищета", "Женщины и насилие" из цикла "Пекинские стратегии — белорусская перспектива", конференция "Гендерные аспекты образования" и другие мероприятия.

Благодаря этому опыту возникла идея создания нашей программы. Действовать она начала с января нынешнего года. Мы разрабатываем образовательные проекты, создаем банк данных и информационную сеть, проводим исследования по проблемам женщин, налаживаем контакты с международными организациями...

В планах — продолжение семинаров из цикла "Пекинские стратегии — белорусская перспектива", которые позволят общественности ознакомиться со стратегией Пекинской платформы, принятой на IV Всемирной конференции по улучшению положения женщин. Подготовка семинаров предусматривает изучение реального положения белорусских женщин, что позволит определить приемлемые политические решения.

В феврале и апреле нынешнего года состоялись два первых семинара этого цикла. Участие в них приняли лидеры женских НПО, женщины-журналисты, социологи, эксперты из России и Великобритании. Состоялось первое заседание постоянно действующего "круглого стола" "Женщины и политика", на котором была определена концепция этой программы как мероприятия по политическому образованию женщин разных идеологических ориентаций, установлению между ними контактов и обмену информацией.

Все наши усилия направлены на развитие и консолидацию женского движения в Беларуси и изменение к лучшему положения женщин.

Людмила ПЕТИНА, координатор программы ММОЦ "Женщины и развитие".

Анонс

Если вы хотите сотрудничать с Германией

20—21 августа в Минском международном образовательном центре состоится белорусско-германская конференция по дальнейшему углублению сотрудничества. Из ФРГ приезжает представительная делегация в составе около 25 человек. Среди них — депутат Европарламента Эрика Манн, бывший министр земли Северный Рейн — Вестфалия Герберт Шнор, по инициативе которого в Минске открыт детский хирургический центр, прибудут также многие деловые люди Германии. Ожидается участие в форуме Василия Быкова, Валерия Тихини, других известных белорусских людей, а также бизнесменов. Они обсудят ход реализации совместных проектов, а также новые предложения, обменяются мыслями об открытии белорусско-немецкого центра "Покаяние".

Все, кого интересуют вопросы сотрудничества с организациями, фирмами Германии, могут принять участие в диалоге. Контактный телефон в Минске 270-39-94.

Открытие деревни

Оно состоится 19 августа. Деревня называется Дружная. Она построена рядом с поселком Занорач Мядельского района. Возведена переселенцами из чернобыльской зоны по немецкому проекту и с участием граждан ФРГ, которые изъявили желание поработать на этой стройке. На торжества по случаю заселения новых домов приезжает группа граждан из Германии, при участии которых и появилась эта деревня на карте Беларуси.

Андрей ВАСИЛЬЧУК.

Молодежные контакты

С берегов Свислочи — на берега Рейна

Когда в октябре 1996 года после окончания визита в Минск молодые социалисты из немецкого города Мёнхенгладбах (земля Северный Рейн — Вестфалия) пообещали, что следующая встреча молодежи обязательно пройдет на немецкой земле, их слова большинством белорусских участников встречи были восприняты лишь как элементарная благодарность за интересную программу в Минске.

Но, возвратившись в Германию, молодые люди от слов перешли к делу. Была создана общественная инициативная группа "Студенческий обмен — Минск", были написаны десятки писем в различные инстанции, организованы семинары и "круглые столы", на которых рассказывалось о далекой и, к сожалению, для многих не известной стране Беларусь. Результатом этой подготовительной работы стало то, что инициативу студенческого обмена поддержали как на официальном уровне (министр — президент земли Северный Рейн — Вестфалия Йоханнес Рау, главный бургомистр г.Мёнхенгладбах Х.Ельдхеге), так и на уровне различных государственных и общественных организаций и частных лиц.

И вот 25 студентов минских вузов, членов "Студенческого круга" при ММОЦ, ранним утром 4 июля отправились в путь. 10-дневная программа их пребывания в Германии была не только интересной и разнообразной, но во многом и поучительной. Минчане побывали в Бонне, Дюсельдорфе и даже в голландском городе Роермонт. Везде они встречались с официальными лицами и своими немецкими сверстниками, вели дискуссии об общеевропейском процессе и молодежных проблемах. Интересен был семинар в фонде Эберта. В Бонне минские студенты посетили музей истории ФРГ. Им запомнится и поездка в город Ахен, который расположен на стыке границ Германии, Бельгии и Голландии.

Белорусские студенты не только почерпнули много нового, поучительного, но и установили контакты с немецкими сверстниками, которые уже в октябре собираются приехать в Минск. И это будет уже встреча старых друзей.

Александр ШЕВЧУК, референт IBB.

Хроника событий

Цейсс и Шотт приходят в Беларусь

Открыто представительство немецких фирм Карл Цейсс и Шотт Гласверке в Республике Беларусь. Первая из них занимается производством очковой оптики, полупроводниковой, медицинской и контрольно-измерительной техники, имеет предприятия в пяти странах мира, в том числе в США и Беларуси. Вторая выпускает хозяйственное стекло, бытовую технику, оптику и оптоэлектронику.

Цель представительства — наладить деловое сотрудничество с предприятиями и фирмами Беларуси, других стран СНГ. Глава Администрации президента Беларуси Михаил Мясникович, который выступил при открытии представительства, выразил надежду, что фирмы группы Цейсс и Шотт будут заниматься не только торговлей, но и создавать совместные предприятия по производству высокоточной оптической продукции.

В открытии представительства приняли также участие министр юстиции Беларуси Геннадий Воронцов, первый секретарь Посольства ФРГ в Беларуси Петер Циглер.

Интерес "Немецкой волны"

С 14 по 20 июля в Минском образовательном центре находился заместитель исполнительного директора радиостанции "Немецкая волна" Фрамк Лемке. Он приезжал сюда с интересными проектами в области информации и повышения квалификации репортеров, интересовался условиями, необходимыми для их реализации.

Необычное решение фрау Кётчау

Почти неделю провела в Беларуси по линии Международного образовательного центра вице-президент ландтага (парламента) земли Шлезвиг-Гольштейн Германии фрау Кётчау. Причем приехала не одна, а с семьей. Как она сама сообщила, решила провести здесь часть своего отпуска.

Выставка работ Чикера-Агинского

Картины этого художника, правнука известного композитора Агинского, выставлены в Минском международном образовательном центре. На них — пейзажи родного края, вызывающие раздумья о его судьбе.

Интересно, что сам автор проживает рядом с центром, на Юго-западе белорусской столицы. В шести районах Беларуси он открыл картинные галереи. Выставка его работ посвящена 930-летию Минска.

Знакомство с "Надеждой"

В Беларуси побывала делегация центра повышения квалификации взрослых из Вестфалии. Гости из ФРГ ознакомились с политической и экономической ситуацией в нашей стране, посетили оздоровительный центр "Надежда", детскую поликлинику, деревню, в которой живут переселенцы из чернобыльской зоны.

Возможно, Минск станет женской столицей

Интересная и важная международная конференция состоялась в минувшем месяце. Ее проводила Христианская ассоциация молодых женщин. Эта влиятельная на Западе организация стремится приобщить женщин к активному участию в общественной жизни своих стран. Сейчас она пытается помочь в этом и женщинам Восточной Европы. С этой целью и была организована международная конференция в Минске.

На нее съехались представительницы прекрасной половины из Албании, Болгарии, Украины, Литвы, России, Нидерландов, Великобритании, Швейцарии, Румынии. Они проанализировали состояние дел в женском движении мира, ситуацию в различных регионах, обменялись мнениями о роли женщин в жизни общества и о путях активизации женского движения в Восточной Европе.

Участницам конференции понравился Минск, его женщины и Международный образовательный центр (МОЦ). Они пришли к мнению, что белорусская столица вполне подходит для размещения здесь штаб-квартиры женской ассоциации стран Восточной Европы. Вот только политическая ситуация здесь нехорошая, не европейская. Так что не исключено, что Минск, благодаря МОЦу, может стать центром престижной организации женского движения.

Сергей ВАСИЛЬЧУК.

Дайджест

Беременность нежелательна. Выход в стерилизации?

Для молодых англичанок карьера превыше всего, считает корреспондент британской "Таймс". И главное препятствие на пути к заветной цели многие из них видят в нежелательной беременности. Применение контрацептивов англичанки считают делом обременительным, да к тому же вредным для собственного здоровья. Более того, опрос деловых английских женщин в возрасте 20-30 лет показал, что практически все они видят в детях источник лишних раздражений и волнений. Неслучайно большинство англичанок ежедневному употреблению таблеток предпочитают дорогостоящую операцию по стерилизации. Нездоровый интерес английских женщин к карьере вызывает серьезные опасения у министерства здравоохранения Великобритании относительно будущего генофонда страны, пишет газета. Дело в том, что за последнее время уровень рождаемости в Великобритании резко упал. А количество женщин, отдающих предпочтение стерилизации, в свою очередь, быстро увеличивается.

После Мао Цзедуна у китайцев новый культ. Культ еды...

"Молодой" Китай страдает от переизбытка веса, считает корреспондент британской "Санди Таймс". Родители, пережившие "большой скачок" и тиранию Мао Цзедуна, стараются как можно чаще и обильнее кормить своих детей и тем самым наносят непоправимый ущерб их здоровью. Дело в том, что каждый второй китайский ребенок страдает от ожирения. По мнению автора статьи, кормление детей китайцы давно превратили в культ, а самих детей — в "маленьких принцев и принцесс". Помимо проблем со здоровьем "культивирование" еды во многом объясняет отход китайцев от национальных традиций. Если раньше дети в Китае считались помощниками родителей в старости, то сейчас все происходит с точностью до наоборот. По словам корреспондента "Санди Таймс" в Китае, самым распространенным явлением на улицах Пекина стала измученная бабушка, ведущая своего упитанного внука в "МакДональдс".

Стюардессы для японцев — не авторитет. Почему?

Терпеливые и всегда вежливые японцы совершенно не могут пристойно себя вести на борту самолета, пишет газета "Санди Таймс". Любой полет с японцами на борту для членов экипажа самолета равносилен самой страшной смерти. Японцы постоянно нарушают правила поведения на борту самолета, вступают в пререкания со стюардессами и даже иногда наносят им телесные повреждения. Успокоить разбушевавшихся японцев практически невозможно, пишет газета. Однако, по информации газеты, компания ДЖАЛ намерена установить на борту каждого самолета несколько видеокамер с тем, чтобы нарушитель правопорядка предстал перед судом после приземления.

"Новые русские" покупают... титулы

Британская газета "Санди Таймс" посвящает статью новому увлечению "новых русских". Сначала "новые русские" занимались исключительно покупкой быстрых автомобилей, драгоценностей и многоэтажных особняков. Сегодня они покупают титулы. По мнению автора статьи, "новые русские" устали от своего несколько вульгарного имиджа, а потому во что бы то ни стало решили стать аристократами. И что интересно, предпочтение они отдают английским титулам. Объяснить это явление автор статьи не берется. Право на место в палате лордов титул, как известно, не дает. Единственное преимущество — титулованный барон становится членом Манориального общества Великобритании, которое, как известно, занимается устроительством общественных мероприятий. Тем не менее, по информации газеты, среди "новоиспеченных британских аристократов" есть и депутаты Госдумы. А стоит каждый титул в среднем пятнадцать тысяч фунтов стерлингов, пишет в заключение "Санди Таймс".

Военным самолетом в Латинскую Америку можно долететь. Но американским

Президент США Билл Клинтон отменил 20-летний запрет на продажу американских самолетов и передовых видов вооружения в Латинскую Америку, сообщает "Рейтер". По мнению агентства, к такому решению президента подтолкнули известия из Чили о том, что эта страна собирается обновлять свои ВВС и проявляет интерес к американским истребителям Ф-16. Кроме того, США опасаются конкуренции со стороны России и других стран на рынке вооружений в регионе. Например, недавно Перу закупило истребители МИГ-29 в России и Беларуси. Запрет был введен Администрацией президента Джимми Картера, поскольку в то время в большинстве стран Латинской Америки у власти находились военные и диктаторские режимы. В настоящее время, по мнению американской Администрации, ситуация изменилась к лучшему. Тем не менее некоторые члены конгресса подвергли решение президента резкой критике. Они считают, что странам Латинской Америки есть куда потратить громадные средства, которые пойдут на закупку вооружений. Кроме того, это лишь подтолкнет гонку вооружений в регионе.

В хорватском городе Яйце "вылупились" банды в... масках. Изгоняющие боснийских мусульман

Хорваты изгоняют боснийских мусульман из их домов в городе Яйце, сообщает "Ассошиэйтед Пресс". Мусульмане, которые отважились вернуться в свои дома в контролируемом хорватами городе, были изгнаны оттуда бандами пьяных хорватов в масках. Хорваты также забросали камнями автомобили наблюдателей ООН, которые сопровождали мусульман. Полиция практически бездействовала. Власти города Яйце были одними из немногих, кто дал согласие на возвращение представителей национальных меньшинств в свои дома, оставленные во время гражданской войны. Президенты Хорватии и Боснии Франьо Туджман и Алия Изетбегович должны обсудить создавшееся положение во вторник, сообщает "Ассошиэйтед Пресс".

Подготовила Светлана Светина

З юбілеем, Іван Антонавіч!



Янка Брыль.

Фота Ул. Крука.

Шматлікія чытачы, шырокая грамадскасць Беларусі горача вітаюць і віншуюць аднаго з лепшых яе сыноў — народнага пісьменніка Янку Брыля з нагоды яго слаўнага 80-годдзя. Шэсцьдзесят гадоў таму Іван Антонавіч дэбютаваў як паэт і публіцыст, шэсцьдзесят гадоў таму пачаўся яго цяжкі, няпросты, поўны нястомных духоўных пошукаў і вялікіх мастацкіх дасягненняў творчы шлях. На рахунку юбіляра — незлічоныя апавяданні, аповесці, нарысы, раманы, зборнікі дзённікавых нататкаў і лірычных успамінаў, кнігі для дзяцей, літаратурна-крытычныя артыкулы і эсэ, мастацкія пераклады з польскай, рускай, украінскай моў. У сааўтарстве з А.Адамовічам і Ул.Калеснікам ім напісана дакументальная кніга "Я з вогненнай вёскі...". Прыхільнікі незвычайнага светлага таленту Янкі Брыля мелі шчаслівую магчымасць паставіць на свае кніжныя паліцы Зборы яго твораў — у 2, 4 і 5ы тамах.

У сваёй прадмове да рамана "Птушкі і гнёзды (Кніга адной маладосці)" Янка Брыль зрабіў прынцыпова важнае прызнанне: "Для гэтай кнігі я аддаў свайму герою многае з пражытага. А ўсё ж яна — "не аўтабіяграфія, а — біяграфія адной душы", расказ пра яшчэ адзін шлях да святла, пра яшчэ адно месца ў страі яго абаронцаў. Кніга напісана не па праву заслуг і пакут. Толькі па праву любасці да Чалавека — які ён ёсць, які ён будзе або павінен быць". Свой апошні зборнік, які толькі што ўбачыў свет, Іван Антонавіч Брыль назваў шматзначна: "Дзе ваш скарб". Ваш, твой скарб там, дзе тваё сэрца, а тваё сэрца там, дзе твае родныя мясціны, дзе твая Бацькаўшчына.

Любасць да чалавека і любоў да Бацькаўшчыны — вось той эмацыянальна-духоўны лейтматыў, які вызначае старонкі творчасці Янкі Брыля. І любасць гэтая ўзаемная. Са шчырай, нязменнай любоўю звяртаюцца сёння да яго чытачы, у тым ліку калектыў газеты "Народная воля".

Янка БРЫЛЬ

Дзве пахаронкі

У жніўні сорак дзевятага, калі я, праз дваццаць сем гадоў пасля таго, як мяне вывезлі з Адэсы, наведаў горад майго пачатку, з ім нас, мяне і жонку з нашай малою дачкой, знаёміла ўдава майго найстарэйшага брата.

Таго амаль легендарнага Валодзі, які павінен быў забраць мяне з заходнебеларускай вёскі ў савецкі горад, як толькі я падрасту, а брат, закончыўшы свой сельгасінстытут, усталюецца ў пэўную самастойнасць. З гэтым не атрымалася... А ў трыццаць восьмым Валодзю закатавалі ў Белай Царкве, паблізу якое ён працаваў заатэхнікам у саўгасе.

Братавая Надзя да сваіх сарака чатырох пастарэла ў злыбедах жонкі "ворага народа", працавала кандуктарам трамвая, жыла ў пакойчыку старога дома з падлеткам сынам. На гэты дзень яна ўзяла адгул. Калі мы селі ў трамвай і я хацеў узяць білеты, Надзея Іванаўна шапнула:

— Не надо, Ваничка. Кондуктор — моя знакомая, проедем и так.

Усмешка яе бядняцкай задаволенасці, што можа вось і так яшчэ пачаставаць дарагіх гасцей, запомнілася мне ледзь не поруч з яе расказам пра першае і адзінае спатканне з арыштаваным мужам.

Позним зімовым вечарам, нарэшце падпільнаваўшы, дачакаўшыся таго, ад каго гэта залежала, яна ўпала перад ім на калені, у снег, і ён — надзіва — дазволіў спатканне.

Валодзя быў скатаваны, у пашматаным, выбруджаным адзенні, і ён здолеў неяк шапнуць ёй:

— Я ничего не подписал.

У вёсцы маці расказвала мне, хлапчуку, што ён быў гарачы і горды...

Згадаю дзве паперыны.

Рабочы хлопец, шафёр аўтобуса, наведаў мяне ў бальніцы. Усім, хто прыходзіў, я быў, вядома, рады, аднак з асаблівай удзячнасцю, з прыемным здзіўленнем сустрэў гэтага госця. Мы зрэдку перазвоньваліся, сустракаліся яшчэ радзей, але ж вось ён дачуўся, сабраўся і перадачку прынёс. Я памятаю яго яшчэ няўрымслівым падшпаркам у апошнім ваенным годзе; сустракаўся з яго старэйшым братам, прыгожым, выхаваным юнаком, перад самым яго адыходам у армію; ведаў іхнюю маці, прыбіральшчыцу, ціхую, цягавітую кабеціну з дабрадушнай усмешкай. І ў беднасці, і ў ваенным ліхалецці яна здолела падняць сваіх гарушчых мальцаў людскімі ды не распуснымі, як і хацеў бы іх бацька, які прапаў недзе ў лагеры. Калі мы з маім нечаканым госцем, я лежачы, ён седзячы, гутарылі паціху, між іншым успамінаючы яго маму і брата, ён дастаў партманэ, пашукаў у ім і падаў мне паперыну.

Так я і ўбачыў першую "пахаронку".

У маім Загоры з франтоў не вярнулася трыццаць чалавек. У старэйшай сястры загінуў адзіны сын. Аднак такой паперкі мне ўбачыць не прыйшлося. Ніхто не паказаў, а сам жа не будзеш прасіць. Нават у сястры не змог.

А тут я трымаў яе ў руках і праз тры дзесяткі гадоў бачыў і таго, хто не вярнуўся, і тую, што плакала да апошняга дня. Мне стала сцішна, уявіўшы, як ён, гэты шматок казённай паперы, быў прачытаны найбліжэйшымі першы раз...

Значна раней за тую ціхую гутарку ў бальніцы я таксама ўпершыню, і толькі яе адзіную, убачыў іншую "пахаронку" — даведку пра пасмяротную рэабілітацыю. Калі дакладней, дык копію з яе, прысланую мне братавай.

На танна-жаўтлявым лістку не вельмі спраўна было надрукавана, што ваенны трыбунал кіеўскай ваеннай акругі 8 студзеня 1957 года пераглядзеў справу па абвінавачанні майго брата і вырашыў, што "постановление Тройки (так яно там — з вялікай літары!) при Киевском Облуправлении НКВД УССР от 28-го сентября 1938 года в отношении Бриля Владимира Антоновича *отменено* (тут і далей падкрэслена машыністкай) и дело о нем производством *прекращено* за отсутствием состава преступления". Гэта ўжо не падкрэслена.

"Ён быў, сынок мой, гарачы і горды..."

А ўжо не з матчыных слоў, а з братавага пісьма памятаю такое.

Вясной трыццатага года па нашых мясцінах прайшоў вялікі градабой, і мы пра гэтую бяду напісалі братам за мяжу. Бо іх жа там было ў нас два — Уладзімір і Ігнат. Выразна помніцца, як адказаў нам Валодзя, — тыя словы з яго пісьма, што тады не здаваліся мне, дый старэйшым у нашай сям'і, небяспечнай неасцярожнасцю:

"Вы пишете, что у вас побил град. А кто у нас побил — черт его знает".

І гэта, відаць, пра "год вялікага пералому", а то ўжо і пра набліжэнне смяротнага голаду на хлебароднай Украіне?..

Нядаўна я прачытаў у газеце такое выказванне:

"Усе асобы, якія абвінавачваліся ў шпіянажы, асуджаліся толькі ваенным трыбуналам. У адпаведнасці з законам перагляд гэтых спраў, а іх была пераважная большасць, аказаўся ў кампетэнцыі галоўнай ваеннай пракуратуры".

Асуджанага "тройкай" рэабілітаваў ваенны трыбунал. Значыцца, і тут *хвароба часу* — шпіёнаманія. Не абмінула гэта, як відна, і Валодзю.

А Надзя казала, што яго судзілі — так гаварылася ў саўгасе, пакуль яе з малымі адтуль не выгналі, — як "разоблаченного сына польского помещика"...

Ад кіеўскіх сяброў я даведаўся, хто ўвосені трыццаць восьмага ўзначальваў тую "тройку", што з вялікай літары. Таварыш сакратар абкома за дваццаць наступных гадоў вырас да кіраўніка адной з рэспублік. "За Богам маліта, за царом служба не прападаюць". Калі ён прыехаў на святкаванне саракагоддзя БССР на чале сваёй дэлегацыі, я горка пажартаваў пры сябрах, што вось вазьму тую "пахаронку", падыду ў перапынку да высокага госця і спытаюся: ці памятаеце вы, паважаны, такую вось справу? І назаву, і пакажу, і дадам. Хоць і ведаю, што дарма гэта, — адкуль жа яму памятаць? Што — ён, мой брат, адзін прайшоў праз такі суд?.. Дый наогул — як гэта несалідна, калі не горш: далі вам, Брыль, запрашальны білет на такое высокае святкаванне, а вы?.. Да госця такога — ды з чым? Трэба ж думаць!.. Хоць яно — вы, чаго добрага, скажаце — і праз тры гады пасля Дваццатага з'езда...

Гістарычны Дваццаты яшчэ свяжэйшы быў у памяці ў той дзень, калі ў мяне гасцявалі таварышы па працы і я паказаў ім нядаўна атрыманы дакумент пра невінаватасць майго брата.

Адзін з гасцей, былы ваенны журналіст, паэт пасрэдны, але з амбіцыяй ("І Пушкіна пры жыцці не вельмі заўважалі!.."), прыпсаваў нам застолле выпадам супраць другога госця, які меў няшчасце трапіць у палон: "На фронце я такіх, як ты, страляў бы!.." Калі ж даведка, якую я паказваў, апынулася і ў яго руках, ён уважліва паглядзеў яе, з натарыяльным штампам уключна, а тады сказаў мне, гаспадару:

— А што ж ты дагэтуль пра брата маўчаў?

На ўвазе меліся, вядома, і анкеты. Бо ён у нас меў да іх службовае дачыненне.

Цяпер, праз трыццаць гадоў пасля таго застолля, можна спытацца ў мяне: што, і такія ў цябе (або, па-маладому, у вас) гасцявалі?

Што ж, людзі пазнаваліся на паваротах.

Як і цяпер яшчэ ўсё пазнаюцца.

Званок

Гэта было напісана вясной восемдзесят восьмага.

І яно мне здавалася *ўсім*, што я ведаў і буду ведаць пра братаў лёс.

А ў студзені года наступнага, летась, на Рыжскім узбярэжжы, пасля самотнай праходкі па нешматлюдным зімовым пляжы ўздоўж сасонніку на крутым беразе пад стомлена-спакойнае паплёскванне вады і гуллівананадрыўны чаячы крык я запісаў: "У каго спытацца ў Кіеве, як мне даведацца больш пра Валодзю?"

У псіхолагаў, трэба думаць, ёсць адпаведнае тлумачэнне такому стану душы. Я ж толькі заўважаю гэта ў апошнія гады ў самім сабе і не магу назваць такую з'яву інакш, як прадчуванне, уласцівае старасці. Цяпер, больш як праз год, выпісваючы з блакнота тое маё пытанне пра брата, магу ўжо і сказаць, што я, зноў жа цьмяна ды падсвядома, набліжаўся ў той час да таго, што мелася на мяне неўзабаве абрынуцца...

У Кіеве пра Валодзю пытацца не прыйшлося: Кіеў азваўся сам.

23 сакавіка 1989 года — надзвычайная, паваротная дата — уранні з Кіева мне пазваніў незнаёмы журналіст, украінскі карэспандэнт "Литературной газеты". Пазней, калі я пазнаёміўся з гэтым, як для мяне — маладым, энергічным, талковым таварышам, вельмі дзіўнай здалася першая, пасля вітання і рэкамендацыі, фраза яго паведамлення:

— Я хочу вас обрадовать...

Ад гэтай... радасці я разрыдаўся.

Як і тады, калі ў маю сям'ю, таксама па "міжгорадзе", з мястэчковай пошты, у нашым Турцы брат Коля праз хрып і трэск прабіўся з весткай пра зусім нечаканую, недарэчную смерць сярэдняга паміж намі — Мішы.

А яно ж, тое "обрадовать", калі падумаць спакойна, дык і сэнс пэўны тоіць. Страшная таямніца нашага найстарэйшага, пачынаючы з таго званка, пачала раскрывацца, ім пачаўся пакутлівы год, пра які мне трэба расказаць.

За чатыры месяцы да званка з "Литературной газеты", з паведамлення таго самага незнаёмага карэспандэнта я ўпершыню прыняў у памяць слова *Быкаўня*, украінскі адпаведнік нашых Курапатаў. І нават блізка тады не падумаў, што тая назва, той лес пад Кіевам праз нейкі час назаўсёды ўвойдзе ў маё жыццё.

Неўзабаве ў газеце з'явілася ў мільённым памнажэнні друкаванае пацверджанне якраз таго, што мяне ўразіла з тэлефоннай трубкі.

Пры эксгумацыі сталінскіх ахвяр, закапаных у Быкаўнянскім лесе, па знойдзеных там рэчах з індывідуальнымі адзнакамі іх уладальнікаў следства здолела ўстанавіць прозвішчы чатырнаццаці бязвінна рэпрэсіраваных. Сярод іх — наш Валодзя. На месцы захавання знойдзены муштук з надпісам: "Брыль В.А. 16.IX.1937 г.".


Толькі праз сем месяцаў пасля гэтай публікацыі я буду трымаць на далоні той лімоннага колеру касцяны муштучок, які пад зямлёй, сярод астанкаў жахлівай брацкай магілы, праляжаў больш за палавіну стагоддзя. Буду чытаць-перачытваць на ім старанна, далікатна, нават з прэтэнзіяй на арнамент выскрабеныя прозвішча (і маё!), дзве літары ініцыялаў, што так хвалююча, горка, імем брата і бацькі, расшыфроўваюцца ў маёй свядомасці, і дату — дзень, месяц, год, — якая пасля агледзін муштука яшчэ блізу месяц будзе для мяне няпростай загадкай...

Тры невялікія абзацы — столькі я змог напісаць у блакноце пасля таго званка. Аднак і тады, у такім хваляванні, з'явілася думка, нават і прыкрая, — "пра нашу гэтую прафесійнасць"... Ледзь не адразу падумалася, што напішу пра знойдзены муштук, нават слова гэтае вынесу ў загаловак. І гэта, скажам у апраўданне сабе, відаць, зусім натуральна. Калі думаць пра службу словам.

Натуральна яшчэ і таму, што і ў той дзень, і пасля ды пасля да мяне ўсё ішлі ды ішлі сямейныя ўспаміны...

Подиум

Сейчас уже с уверенностью можно сказать: через полгода на подиумах Европы засверкает сверхновая звезда — Катя Окулова. Это — новый проект "Подиума" "МК", о котором настало время рассказать вам. Недавно нами были подписаны все документы, не только разрешающие опубликовать первый материал на эту тему, но и дающие "МК" эксклюзивное право на освещение в прессе всего, что связано с модельной карьерой Кати. Итак, сказки о бедных несчастных Золушках, которые в одночасье становятся принцессами, всем надоели, не правда ли? У нас все по-другому — принцесса российских масштабов пробует работать... в модельном бизнесе.



Одна из первых тестовых фотографий.

ТОП-внучка

Готовя материал к "Стильной странице", посвященной президенту в неформальной одежде, я, как пишут в таких случаях, натолкнулась на фотографию Ельцина, прогуливающегося по дорожкам Барвихи. Прогуливался он в компании Наины Иосифовны, Татьяны Борисовны и... юной, милой и стройной девушки. Девушка была едва ли не ростом с Бориса Николаевича. Генетически это объяснялось просто — девушка была родной внучкой президента. Если бы я встретила ее в метро, я дала бы ей телефон пары модельных агентств и посоветовала позвонить туда. Но эта девушка, явно обладавшая перспективными данными для модельной карьеры, так же явно не ездила в метро... Чутье несостоявшегося букера (человека, ищущего и угадывающего будущие модные лица) не давало мне покоя.

Потихоньку доводя до белого каления своих родственников заветной фотографией, я убеждала их и себя в том, что Катя будет не просто моделью — ей это действительно незачем, а супер-, топ- и просто сенсацией в планетарном масштабе. Родственники присматривались к нечеткой карточке, но максимум, что из них можно было выжать — да, симпатичная худенькая девочка. Не удержалась я, чтобы не достать фотографию и в имиджцентре авторитетнейшего стилиста **Андрея Мановцева**. Он-то в своей жизни "угадал" многих девочек. Однако для чистоты эксперимента я отделила от Кати изображение Дедушки, получилась не Внучка, а просто девушка. "Фигура хорошая. С лицом, особенно с прической надо работать. Вроде на Ельцина чем-то похожа. С таким типом внешности она скорее, конечно, при фантастическом менеджменте, будет работать на подиумах Нью-Йорка, Лондона и Парижа. Рим и Милан — вряд ли". Заключение Мановцева напоминало медицинский диагноз, но прибавляло уверенности.

Окольными журналистскими тропами я стала наводить справки. Оказалось, что ей 17 лет (прекрасный возраст для начала карьеры!), что зовут ее Катя, что она учится на первом курсе МГУ на искусствоведа (вполне интеллигентная специальность, предполагающая склонность к искусству, а может, и моде), что она дочь не Татьяны, а Елены Борисовны, это почему-то тоже казалось мне добрым знаком.

